«Без краязнаўства мы бездапаможныя»

# КРАЯЗНАЎЧЫ ВЕСНІК

▪ № 1 1 ▪ ▪ 3 1 К А С Т Р Ы Ч Н І К А 2 0 1 9 ▪

УА "Лунінецкі ДПТТК"
Аб'яднанне
па інтарэсах
"Краязнаўства"




***Дмітрый Якавец:*** *"Добрага настрою, моцнага здароўя, узаемапаразумення з навучэнцамі, каб усе вашы жаданні ператварыліся ў жыццё".*

***Алеся Мазан:*** *"Цярпення, поспехаў у рабоце, добрых вучняў".*

***Дзіяна Ласюкова:*** *"Здароўя, шчасця і мірнага неба".*

***Віка Ласюкова:*** *"Дабрабыту поспехаў, аптымізму".*

***Васіль Пятроў:*** *"Каб усе навучэнцы былі такімі добрымі і разумнымі, як у свой час былі вы – нашы выкладчыкі, майстры і выхавальнікі".*

***Ксенія Лушчык:*** *"Творчых дастягненяў, радасці, пазітыву".*


- Віншуем з Днём настаўніка! 1
- Калектыўнае сачыненне пра маму 1
- Экскурсія ў вёску Цну 2
- XII Лунінецкія краязнаўчыя чытанні 3
- Кастрычнік у народным календары 3
- Наша творчасць Серыя інфармацыйных буклетаў «Храмы Лунінеччыны» 4
- Мой родны Давыд-Гарадок 4


## КАЛЕКТЫЎНАЕ САЧЫНЕННЕ ПРА МАМУ

Для кожнага з нас самы дарагі на свеце чалавек – мама. Іменна яна падарыла на жыццё, іменна яна заўсёды поўная любові і пяшчоты да нас. Мама суправаджае нас усё жыццё, нягледзячы на тое, знаходзіцца яна побач ці за тысячы кіламетраў. Сіла мацярынскай любові здольна пераадолець любыя перашкоды і адлегласці. Мама – той чалавек, на прыкладзе якога мы вучымся вернасці, любові да блізкіх, павазе да старэйшых… Беражыце сваіх матуль!

*Члены аб'яднання па інтарэсах "Краязнаўства"*



***Толькі месяцаў назвы пакіньце,***
***Назвы родныя роднай зямлі,***
***Пра якія з маленства ў блакіце***
***Бор шуміць і пяюць жураўлі:***
***Светлы кастрычнік***
***У празрыстасці светлай,***
***крынічнай...***

# ЭКСКУРСІЯ Ў ВЁСКУ ЦНУ















У ходзе напісання конкурснай работы "Не дажыўшы да сарака, або Дарогамі Міколы Калінковіча" мы вырашылі наведаць вёсачку Цна Лунінецкага раёна. Іменна адсюль пачалася жыццёвая дарога Мікалая Калінковіча.

Пад'язджаем да мясцовага Дома культуры. Сустракае нас загадчык Ніна Сцяпанаўна Патурай. Яна з'яўляецца і старастай вёскі. Спачатку мы ідзём на вуліцу, дзе была сядзіба Калінковічаў (цяпер тут новыя гаспадары і дом з чырвонай цэглы). Зараз восень, а нам уяўляецца зіма 1950 года. Заснежаная вуліца, драўляная хата, у якой 18 снежня ў 17 гадзін нарадзіўся хлопчык Міколка. Прыйшоў у свет новы чалавек, каб зрабіць свае першыя крокі па зямлі…

Мы вяртаемся ў Дом культуры. У фае вельмі прыгожа і ўтульна. Намаганнямі Ніны Сцяпанаўны афармлены цудоўныя выставы: "Хараство умелых рук" (вышываныя крыжыкам карціны Евы Сцяпанаўны Бусько), "Натхненне" (карціны з каляровых стужак Юліі Віктараўны Скіба), "Чырвонае золата Лунінеччыны", "Цне – 395!" і інш. Сабраны грунтоўны матэрыял пра паходжанне вёскі Цна і афармлены яе летапіс. Убачылі мы тут і элементы этнаграфічнай спадчыны жыхароў вёскі: вышываныя ручнікі, нацыянальнае жаночае адзенне, лапці, гліняныя кубкі, гладышы, міскі.

З вялікай любоўю і павагай афармлены куточак, прысвечаны вядомаму пісьменніку-земляку Мікалаю Мікалаевічу Калінковічу. Гартаем папку з чорна-белымі фотаздымкамі, вытрымкамі з газет, часопісаў: "Жыў чалавек…", "Белый цвет хризантем", "Тут усё пра Палессе…", "Памятаць, каб жыць", "Я зрабіў усё, што мог…", "Падснежнікі і гваздзікі для Міколы", "Як водбліск далёкага агню…" і інш. Маем цудоўную магчымасці патрымаць ў руках невялікую кніжачку М.Калінковіча "Палескія дні Аляксандра Блока", выдадзеную ў Мінску ў 1985г. Асабліва нас зацікавіў асабісты малюнак паэта "Каплічка на Палессі" і фатаграфіі Лунінца і Пінска пачатку XX ст. Галоўная каштоўнасць куточка – памятная дошка М.Калінковіча, якая была ўстаноўлена ў 2000г. на будынку Цнянскай базавай школы. Пасля закрыцця школы Ніна Сцяпанаўна яе захоўвае тут. Таксама яна расказала і паказала нам былую вуліцу Садовую, якая зараз называецца вуліца Калінковіча.

Зараз мы ведаем, што ўсё лепшае: і душу, і справу, і слова, і думкі – аддаў Мікалай Калінковіч людзям. А Ніна Сцяпанаўна Патурай бачыць сваю задачу ў захаванні багатай спадчыны сваёй роднай вёсачкі і памяці вядомага пісьменніка-земляка. Гэта, на нашу думку, самая пачэсная задача.

*Алеся Мазан, навучэнка гр.№24*
*Максім Грэбень і Аляксандр Раковіч,навучэнцы гр.№21*







# XII ЛУНІНЕЦКІЯ КРАЯЗНАЎЧЫЯ ЧЫТАННІ

12 кастрычніка ў Лунінецкай цэнтральнай бібліятэцы прайшлі чарговыя краязнаўчыя чытанні, якія адкрыла дырэктар Лунінецкай бібліятэчнай сістэмы А.Кішкевіч. У пачатку вядучы чытаняў В.Жылко расказаў пра творчыя напрацоўкі лунінецкіх краяўзнаўцаў. У рабоце чытанняў прынялі ўдзел С.Яначкін, які прадэманстраваў кінаафішы 1920-30гг., што захаваліся ў польскіх архівах; госць з Мінска Г.Дземідовіч расказала пра свае знаходкі па гісторыі вёскі Лахва; С.Нефідовіч прэзентаваў свой зборнік па тапаніміцы “Краязнаўчыя нарысы”; пінскі навуковец А.Ільін прадставіў кнігу пра гісторыю Бяроза-Картузскага канцлагера 1934-1939гг.

У ходзе чытанняў прысутныя змаглі ўбачыць відэа фільм пра Свята-Мікалаеўскую царкву, які зняты работнікамі нашага каледжа, а таксама фрагмент фільма пра праваслаўную пісьменніцу Соф’ю Прорвіч.

У канцы сустрэчы дырэктар бібліятэкі правяла агляд літаратуры, пазнаёміла з сайтам бібліятэкі, правяла віртуальную экскурсію па гораду, фрагментарна пазнаёміла з дзейнасцю філіялаў бібліятэкі, якія размешчаны ў Мікашэвічах і вёсках раёна.

*Вікторыя Ласюкова, навучэнка гр.34;*
*Ласюкова Дзіяна, навучэнка гр.14,*
*Кавалевіч Ангеліна і Гарадкавец Дар’я, навучэнкі гр.24*










## КАСТРЫЧНІК У НАРОДНЫМ КАЛЕНДАРЫ

***Зосім.*** Журавіны на Зосіма ўздымаюцца – мароз на Пакровы ўдарыць.

***Астап.*** Людзі прыкмячалі: калі ў гэт ы дзень вецер паўночны - на холад, паўднёвы – на цяпло, заходні – на дождж, ўсходні – на сухое надвор’е.

***Пранцішак.*** Да гэага часу ж ыт а ўсё ўбрана з поля, таму цяжка там знайсці зярнятка. “ На Пранцішка зярнят шукае ў полі мышка”.

***Пачатак Бабінага лета.***
У гэтую пару варажылі на “шчаслівую бабулю”. Усе дні загадзя “раздаваліся” бабулям, якія прымалі роды ў наваколлі: панядзелак – Тэклі, аўторак – Юстыні, сераду – Марцэлы і г. д. Калі дзень выдаваўся сонечны, ціхі, вясёлы, гэта значыла, што рука ў бабулі лёгкая, і роды адпаведна пройдуць лёгка.

***Сяргей.*** Першыя халодныя дні месяца далі падставу ў некаторых мясцінах назваць яго пачаткам зімы. “З Сяргея пачынаецца зіма”.

***Жалезны тыдзень.*** Чысцяць, змазваюць жалезныя рэчы, каб цэлы год не ржавелі і не ламаліся. На Жалезны тыдзень існавалі і забароны: “Пянькі ні мачы – крэпка будзіць”.

***Іван Шаптун.*** Свахі сакрэтна шапталіся з жаніхамі пра нявест, каб зрабіць вяселле. Захаваліся прымаўка: “Іван Багаслоў дружкі разаслаў, а на Пакрова дзеўка гатова”.

***Саўкі.*** У цёплую восень хавалі вуллі ў амшанік, хаця звычайна гэта рабілі ў Засімаў дзень.

***Пакроўны бацька*** – прысвятак за тры дні перад Пакровамі.

*З народнага календара*

# НАША ТВОРЧАСЦЬ

## СЕРЫЯ ІНФАРМАЦЫЙНЫХ БУКЛЕТАЎ «ХРАМЫ ЛУНІНЕЧЧЫНЫ»

У бягучым навучальным годзе на занятках нашага аб'яднання па інтарэсах мы працягваем работу па выданні буклетаў «Храмы Лунінеччыны», якую пачалі ў мінулым годзе. Гэта вельмі значная, цікавая і адказная работа. Кожны храм нашага раёна ўнікальны, непаўторны; у кожнага свая гісторыя. Мы ў буклетах прадставілі інфармацыю пра храм, яго настаяцеля, асобныя цікавыя факты, а таксама галерэю фотаздымкаў унутранага ўбранства храма. Прывесці ўсе звесткі ў сістэму – самая галоўная задача нашай задумы. У выніку намі выпушчана 16 буклетаў.

*Ірына Бярозка, навучэнка гр.№24*





## МОЙ РОДНЫ ДАВЫД-ГАРАДОК





Заснаваны ў 1100 годзе князем Давідам, якому да 900-годдзя гарадка ўзведзены помнік у цэнтральнай частцы. Размяшчаецца гарадок на абоіх берагах Гарыні, якая перасякае яго тэрыторыю і дзеліць горад на тры раёны, звязаныя паміж сабою мастамі. У 2018г. адкрыты новы краязнаўчы музей, а таксама парк. Зараз у Давыд-Гарадку пражывае 7 тысяч жыхароў. Ёсць тут дзве сярэднія школы, а таксама музычная і спартыўная, дзіцячы сад, бібліятэка, кінатэатр. Захавалася Георгіеўская царква XVII стагоддзя, і гарадзішча XII-XIV стагоддзяў – помнік археалогіі. Асабліва мне падабаецца новая царква Казанскай Божай Маці. Яна вельмі прыгожая. Прыязджайце ў мой Давыд-Гарадок – самабытны, непаўторны, з ціхімі, прыгожымі вуліцамі, з добрымі, гасціннымі і працавітымі людзьмі.

*Алеся Мазан, навучэнка гр.№24*

**Друкаваны орган аб'яднання па інтарэсах «Краязнаўства»**

**Выдаецца з верасня 2018г.**

**Галоўны рэдактар:**
Антановіч Галіна Мікалаеўна

**Тэхнічны рэдактар:**
Мазан Алеся

**Рэдакцыйная калегія:**
Бярозка Ірына,
Кавалевіч Ангеліна,
Ласюкова Вікторыя,
Грэбень Максім,
Раковіч Аляксандр

**Наш адрас:**
вул.Чэхава,10а
225644 г.Лунінец
Брэсцкай вобласці

**Наш сайт:**
**www.lgplp.brest.by**

